УДК 821.161.3(043.3)

**А. І. Бельскі**
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск

# ІНТЭЛЕКТУАЛЬНА-ФІЛАСОФСКАЯ ПАЭЗІЯ А. РАЗАНАВА: ВЕРСЭІЗАЦЫЯ, ПРАСТОРАВА-ЧАСАВЫ КАНТЫНУУМ

Раскрываецца жанравая спецыфіка версэтнага мыслення А. Разанава, інтэлектуальна-філасофскія асновы яго паэтычнай творчасці. Асаблівая ўвага адводзіцца разгляду быційнай і прасторавай карціны свету, найбольш значных сэнсавых матываў і вобразаў-сімвалаў.

**Ключавыя словы:** А. Разанаў, версэізацыя паэзіі, інтэлектуальна-філасофская паэзія, навацыі, версэты.

**Уводзіны.** У беларускай паэзіі другой паловы ХХ стагоддзя прыкметна паглыбіўся аналітычна-інтэлектуальны, філасофскі ўзровень думкі, скіраванай на спазнанне часу і быцця, сувязей чалавека з навакольным светам. Гэтая тэндэнцыя знайшла працяг на пачатку новага ХХІ стагоддзя. Алесь Разанаў, які нарадзіўся у 1947 годзе, стаў найбольш значнай творчай індывідуальнасцю ў галіне беларускай філасофскай паэзіі, адным з яркіх і адметных паэтаў інтэлектуальнага складу. Менавіта з яго асобай справядліва звязаны арыгінальныя мастацкія дасягненні і набыткі, інтэрактыўныя жанравыя навацыі, пошукі адметнага паэтычнага маўлення.

Эстэтычны феномен творчасці А. Разанава за апошнія дзесяцігоддзі прыцягваў многіх беларускіх даследчыкаў. Сярод першых узораў удумлівага, паглыбленага аналізу яго паэзіі вылучаецца слова В. Бечыка [1, с. 216—217]. Прыкметным асэнсаваннем філасофскай паэзіі А. Разанава сталі працы Я. Гарадніцкага, А. Кабаковіч, У. Калесніка, У. Конана, Е. Лявонавай і іншых літаратуразнаўцаў. На пачатку 1990-х гадоў Г. Кісліцына абараніла першую дысертацыю па творчасці А. Разанава, а пазней ёю на аснове дысертацыйнага тэксту была падрыхтавана і выдадзена першая манаграфія [2]. З даследаванняў апошняга часу, прысвечаных А. Разанаву, вылучаецца кніга І. Штэйнера «Уводзіны ў невымоўнае» [3]. Сёння можна казаць пра папулярнасць творчай асобы А. Разанава ў маладой генерацыі даследчыкаў, пра што сведчаць параўнальна нядаўна абароненыя кандыдацкія дысертацыі [4; 5], шматлікія артыкулы ў часопісах і навуковых зборніках. Нягледзячы на гэты назапашаны вопыт, уяўляецца актуальным далейшае даследаванне жанрава-відавой сістэмы А. Разанава, выяўленне нацыянальнай спецыфікі і анталагічнай глыбіні яго вобразна-паэтычнага светабачання, сутнасці прасторава-часавых уяўленняў і быційна-філасофскай карціны свету, рэпрэзентаванай у творчасці гэтага аўтара.

**Матэрыялы і метады даследавання.** Асноўным аб'ектам увагі з'яўляюцца версэты А. Разанава — паэтычныя тэксты адметнай, своеасаблівай структурнай арганізацыі. Фактычны матэрыял асэнсоўваецца і інтэрпрэтуецца ў рэчышчы структурнага, тыпалагічнага і культурна-гістарычнага аналізу, што дазваляе акрэсліць своеасаблівасць жанравай мадэлі версэта з улікам тэндэнцыі верлібрызацыі і празаізацыі сучаснай паэзіі, выявіць сутнасць эстэтычнай, ментальна-духоўнай сувязі аўтара і рэальнасці, раскрыць спецыфіку яго светабачання, вобразна-мастацкага і філасофскага асэнсавання свету. У подступе да тэмы часткова скарыстоўваецца біяграфічны метад: гэта дазваляе ўбачыць творчыя пошукі аўтара праз прызму яго неардынарнай мастакоўскай асобы.

Угрунтаванню метадалагічнай асновы гэтага артыкула паспрыялі працы замежных і айчынных навукоўцаў: Ю. Арліцкага, М. Гаспарава,